# СЕКЦИЯ 1
# «ВНЕШНЯЯ ПОЛИТИКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ: ТРАДИЦИИ И СОВРЕМЕННОСТЬ»

## АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ КАФЕДРЫ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА НА ПЕРШЫМ ЭТАПЕ ЯЕ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ (1992—2002 гг.)

**А. В. Гурын**

*Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь,*
*вул. Маскоўская, 17, 220007, г. Мінск, Беларусь, gurin@pac.by*

Мэтай даследавання з'яўляецца аналіз міжнародных даследаванняў кафедры міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта у першыя гады яе існавання. Задачай — выяўленне прадумоў стварэння кафедры і вызначэнне асноўных праблемна-тэматычных накірункаў яе науковай дзейнасці. Аўтар прыходзіць да высновы, што кафедра міжнародных адносін БДУ была створана на трывалым савецкім падмурку; міжнародным даследаванням у БССР паспрыяла знешнепалітычная дзейнасць, якую ажыццяўляла рэспубліка з 1944 г. Адзначаецца, што ўжо ў першыя гады існавання кафедра стала галоўным навуковым цэнтрам даследавання праблем міжнародных адносін і знешняй палітыкі незалежнай Беларусі і ажыццяўляла ўвесь спектр міжнародных даследаванняў, вынікі якіх шырока выкарыстоўваліся органамі дзяржаўнага кіравання, а таксама ў адукацыйным працэсе. Таксама аўтар звяртае ўвагу на існаванне дзвюх навуковых школаў на кафедры: школы вывучэння гісторыі і сучасных міжнародных адносін і школы вывучэння гісторыі знешняй палітыкі Беларусі.

***Ключавыя словы:*** міжнародныя даследаванні; гістарыяграфія міжнародных адносін; кафедра; міжнародныя адносіны; знешняя палітыка.

## FEATURES OF THE DEVELOPMENT OF THE DEPARTMENT OF INTERNATIONAL RELATIONS OF BELARUSIAN STATE UNIVERSITY AT THE FIRST STAGE OF ITS OPERATION (1992—2002)

**A. V. Huryn**

*Academy of Public Administration*
*under the aegis of the President of the Republic of Belarus,*
*17 Moskovskaya Street, 220007 Minsk, Belarus, gurin@pac.by*

The purpose of the study is to analyze the international studies of the Department of International Relations of Belarusian State University in the early years of its existence. The task is to identify the reasons for the creation of the department and identify the main problem-thematic areas of its scientific activity. The author concludes that the Department of International Relations of the BSU was established on a solid Soviet foundation; international studies in the BSSR were facilitated by foreign policy activities carried out by the republic since 1944. It is noted that in the early years of its existence, the department became the

main scientific center for the study of problems of international relations and foreign policy of independent Belarus and carried out a full range of international studies, the results of which were widely used by government agencies, as well as in the educational process. The author also draws attention to the existence of two scientific schools at the department: the school for the study of History and modern International Relations and the school for the study of the history of foreign policy of Belarus.

***Keywords:*** international studies; historiography of international relations; department; international relations; foreign policy.

Пэўныя традыцыі вывучэння і выкладання гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі замежных краін склаліся ў беларускай навуцы яшчэ ў савецкі перыяд: яны развіваліся ў межах Белдзяржуніверсітэта і Акадэміі навук — двух галоўных цэнтраў адукацыі і навукі рэспублікі.

Цэнтрам вывучэння гісторыі міжнародных адносін быў БДУ (кафедра старажытнага свету і сярэдніх вякоў і кафедра новай і навейшай гісторыі гістарычнага факультэта); даследаванне гісторыі знешняй палітыкі Беларусі (на прыкладзе БССР) ажыццяўлялася ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук БССР. У 1970—1980-я гг. знешнепалітычная тэматыка таксама пачала распрацоўвацца асобнымі даследчыкамі ў іншых установах вышэйшай адукацыі Беларусі [1, с. 46].

Універсальная гісторыя міжнародных адносін у асноўным вывучалася ў БДУ, хоць і ў тэматычна і храналагічна абмежаваных рамках. Гэта гісторыя міжнародных адносін у Еўропе ў другой палове XIX ст., звязаная з працэсам аб’яднання Германіі; гісторыя еўрапейскіх міжнародных адносін у XX ст., звязаная з узнікненнем Першай сусветнай вайны ў Еўропе; гісторыя міжнародных адносін міжваеннага перыяду і пасляваенных часоў (германская праблематыка, праблемы бяспекі, адносіны СССР з замежнымі краінамі). Вывучэнне знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР узяло свой пачатак у 1960-я гг. У гэты час былі абаронены першыя кандыдацкія дысертацыі па знешнепалітычнай дзейнасці БССР перыяду 1940—1960-х гг. і міжнароднай правасуб’ектнасці рэспублікі і апублікаваны першыя навуковыя манаграфіі па гэтай тэматыцы. Рост навуковых дасягненняў у галіне даследавання знешнепалітычнай актыўнасці і міжнародных сувязях БССР стаў адной з прычын стварэння ў 1982 г. на базе сектара гісторыі еўрапейскіх сацыялістычных краін Інстытута гісторыі АН БССР аддзела гісторыі замежных сувязей БССР.

Нягледзячы на тое, што доўгі час навуковыя падраздзяленні не маглі разгарнуць сваю працу па даследаванню міжнародных адносін, іх дзейнасць у савецкі перыяд паспрыяла складванню асноўных тэматычных накірункаў сучаснай школы міжнародных даследаванняў, метадалагічных падыходаў, кадравага патэнцыялу і структурных адзінак.

Кафедра міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага універсітэта была створана па некалькіх прычынах. Па-першае, новая кафедра стваралася ў мэтах падрыхтоўкі беларускіх спецыялістаў для Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Па-дугое, кафедра павінна была

стаць вучэбна-метадычным цэнтрам вышэйшай школы краіны ў галіне міжнародных адносін. Па-трэцяе, на базе кафедры павінен быць створаны навукова-арганізацыйны цэнтр, які б каардынаваў намаганні айчынных даследчыкаў у галіне міжнародных адносін.

Няма сумневу, што першая з прычын стала вызначальнай. Першы загадчык кафедры з моманту стварэння і да 2015 г. і адначасова дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ (1995—2008 гг.) прафесар А. В. Шарапа адзначае: «Суверэннай Рэспубліцы Беларусь неабходна было прадстаўляць свае інтарэсы ў міжнароднай супольнасці самастойна. Для паспяховай рэалізацыі гэтай задачы патрэбныя былі ўласныя кадры знешнепалітычнага апарата. Некалькі дзясяткаў чалавек, якія працавалі ў сістэме МЗС СССР, вярнуліся ў Беларусь з Масквы. Але іх было вельмі мала. Наспела неабходнасць падрыхтоўкі сваіх спецыялістаў у міжнароднай сферы. Я ўнёс такую прапанову ў рэктарат, і ў 1992 г. мы адкрылі кафедру міжнародных адносін на гістарычным факультэце БДУ» [2].

Пачатковы этап стварэння кафедры звязаны з трымя знамянальнымі датамі: 23 сакавіка 1992 г. і 1 верасня 1992 г. — рашэнні Вучонага савета БДУ аб стварэнні кафедры міжнародных адносін і яе ўключэнні ў склад гістарычнага факультэта, а таксама 1 кастрычніка 1995 г. — дата стварэння факультэта міжнародных адносін БДУ, у складзе якога кафедра стала сістэмаўтваральнай [3, с. 11].

Асноўнай задачай першых год існавання кафедры стаў падбор кваліфікаваных педагагічных кадраў у галіне тэорыі і гісторыі міжнародных адносін і іх пэўная пераарыентацыя на навучальны працэс падрыхтоўкі беларускіх дыпламатаў; у савецкія часы ў Беларусі фактычна адсутнічалі спецыялісты-міжнароднікі (дэ-юрэ) — большасць вучоных і педагогаў абаранялі дысертацыі па так званых «унутрыдзяржаўных» спецыяльнасцях. Без гэтага было немагчыма дабіцца выканання другой «задачы», дзеля якой стваралася кафедра: стаць вучэбна-метадычным цэнтрам у галіне міжнародных адносін.

У першыя гады свайго існавання кафедра міжнародных адносін сабрала ў свой склад аўтарытэтных спецыялістаў у галіне выкладання дысцыплін міжнароднага профілю і вывучэння знешнепалітычных праблем. Гэта дактары гістарычных навук, прафесары А. В. Шарапа, А. А. Разанаў, А. А. Чалядзінскі; кандыдат гістарычных навук, дацэнт Л. В. Лойка. У верасні 1993 г. на кафедру прышоў з Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі У. Е. Снапкоўскі, які абараніў у 1993 г. доктарскую дысертацыю па праблемах знешнепалітычнай дзейнасці БССР у 1944—1953 гг. Прафесар У. Е. Снапкоўскі успамінае: «Пасля зацвярджэння дысертацыі ВАКам я паставіў пытанне аб пераходзе ў БДУ перад дырэктарам Інстытута гісторыі М. П. Касцюком. Мяркую, што ён быў падрыхтаваны да гэтага крока, паколькі ведаў пра дзейнасць новай кафедры, яе патрэбы ў кваліфікаваных кадрах і мае сувязі з гістфакам БДУ. Маё рашэнне было ўспрынята Міхаілам Паўлавічам з пэўным шкадаваннем, бо дырэктар не хацеў губляць маладога доктара навук, выхаванага

у інстытуце, свайго аднадумца і паплечніка, і адначасова з разуменнем, паколькі я пераходзіў на працу, якая мела агульнадзяржаўнае значэнне, маючы на ўвазе падрыхтоўку беларускіх дыпламатаў» [4, с. 25].

З першых гадоў існавання кафедры тут працавалі кандыдаты гістарычных навук, дацэнты Н. Я. Аблава, С. Ф. Свілас, Л. М. Хухлындзіна. З другой паловы 1990—х гг. калектыў кафедры папоўнілі кандыдаты гістарычных навук, дацэнты А. І. Гардзейчык, У. А. Елфімаў, М. Э. Часноўскі, В. Г. Шадурскі; кандыдаты палітычных навук, дацэнты А. А. Дастанка і Ю. І. Малевіч. У 2000 г. дацэнты М. Э. Часноўскі і В. Г. Шадурскі паспяхова абаранілі доктарскія дысертацыі па новай для беларускай навукі спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі». Такім чынам, па стану на верасень 2002 г., калі фактычна скончыўся этап станаўлення кафедры, у яе склад уваходзілі 6 дактароў гістарычных навук, прафесароў, 5 кандыдатаў гістарычных навук, 2 кандыдата палітычных навук [1, с. 47]. Па сваім кадравым патэнцыяле кафедра міжнародных адносін стала адным з самых кваліфікаваных падраздзяленняў БДУ і ўсёй сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусі. Трэба адзначыць, што такі статус заставаўся ў кафедры на ўсіх перыядах яе існавання.

Практычна з моманту стварэння кафедры супрацоўнікамі амаль што з чыстага ліста была распачата распрацоўка навукова-метадычнага забеспячэнне спецыяльнасцяў: па вучэбных дысцыплінах адсутнічалі беларускія вучэбныя праграмы, метадычныя матэрыялы, літаратура. Прафесар А. В. Шарапа ўспамінае, што «Паглыблена вывучаўся вопыт Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін...». У выніку гэтага атрыманыя арыенціры былі адаптаваныя, дапрацаваныя. Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь зацвердзіла вучэбныя планы, якія былі прызнаныя як тыпавыя для вышэйшай школы» [5, с. 11]. Паступова вучэбныя дысцыпліны вучэбных планаў набылі неабходную легітымізацыю і інстытуцыянальнае афармленне.

Дзякуючы даследчыкам кафедры быў створаны і апублікаваны шэраг падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па сістэмаўтваральным дысцыплінах. Гэта некалькі выданняў навучальнага дапаможніка «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» (аўтар — У. Е. Снапкоўскі), комплексная праца «Гісторыя міжнародных адносін», дапаможнікі па тэорыі міжнародных адносін [6—9].

Пашырэнне колькасці дысцыплінаў вучэбных планаў спецыяльнасцяў факультэта міжнародных адносінаў патрабавала выдання навучальных дапаможнікаў. У гэтым працэсе ўзялі актыўны ўдзел прафесары Ю. І. Малевіч, С. Ф. Свілас, А. В. Шарапа, дацэнты С. А. Лашкевіч, А. В. Ціхаміраў, Л. М. Хухлындзіна і інш. [7—15].

Фарміраванне навукова-метадычнага забеспячэння спецыяльнасцяў факультэта міжнародных адносін месцілася на трывалым падмурку навуковых даследаванняў, якія быў закладзены у БДУ яшчэ ў савецкі перыяд. Пры ўжо на першым этапе існавання кафедры міжнародных адносін праходзіў двухбаковы працэс: з аднаго боку, фарміраванне навукова-ме-

тадычнага забеспячэння месцілася на выніках навукова-даследчай работы, з другога боку пашырэнне і паглыбленне навуковай тэматыкі вяло да павялічэння вучэбных дысцыплінаў і спецыяльных курсаў. У сваю чаргу, павелічэнне вучэбных дысцыплін і спецыяльных курсаў, вяло да павелічэння колькасці выкладчыкаў, важнай часткай працы якіх з'яўляюцца навукова-даследчая работа, а таксама неабходнасці абароны дысертацый і атрымання навуковых званняў. У выніку, кафедра не страціла свайго першапачатковага навуковага персанала з цягам часу, але і пашырала яго, нягледзячы на шэраг негатыўных момантаў, такіх як аб'ектыўная змена пакаленняў даследчыкаў, ці структурныя змены на факультэце міжнародных адносінаў.

Асноўныя накірункі навуковых даследаванняў кафедры вызначыліся ўжо на першым этапе яе існавання. Гэта праблематыка знешняй палітыкі Беларусі XX ст. і даследаванне асобных праблем гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі замежных краін у XX ст., а таксама тэорыі міжнародных адносін. У наступныя перыяды развіцця кафедры гэтыя накірункі былі паглыблены тэматычна і храналагічна; з'явіліся новыя праблемы даследаванняў. Ужо ў першыя гады існавання кафедры сталі фарміравацца дзве навуковыя школы: школа вывучэння гісторыі і сучасных міжнародных адносін (кіраўнік — прафесар А. В. Шарапа) і школа гісторыі знешняй палітыкі Беларусі (кіраўнік — прафесар У. Е. Снапкоўскі).

Такім чынам, можна адзначыць, што кафедра міжнародных адносін БДУ была створана на трывалым падмурку, які быў закладзены ў савецкі перыяд; шмат у чым развіццю міжнародных даследаванняў у БССР паспрыяла знешнепалітычная дзейнасць, якую ажыццяўляла БССР з 1944 г. З першых гадоў існавання кафедра па-праву стала галоўным цэнтрам міжнародных даследаванняў незалежнай Беларусі, яна акумулявала ў сваім складзе лепшых спецыялістаў-міжнароднікаў, ажыццяўляла ўвесь спектр міжнародных даследаванняў, вынікі якіх шырока выкарыстоўваліся органамі дзяржаўнага кіравання, а таксама ў навучальным працэсе.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. Гурын, А .В. Аб навуковых даследаваннях кафедры міжнародных адносін факультэта міжнародных адносін БДУ (1992—2002 гг.) / А. В. Гурын, У. Е. Снапкоўскі // Белорус. журнал междунар. права и междунар. отношений. — 2002. — № 3. — С. 46—51.

2. Петрулевич, Л. Ф. Александр Шарапо: «На моем жизненном пути как профессора и исследователя основную роль сыграло трудолюбие, которое было привито моими родителями» // Лидская газета. — 10.06.2021. — URL: https://lidanews.by/news/25-voprosov-o-lichnom/23015news.html (дата обращения: 20.08.2024).

3. Шарапо, А. В. 25 лет кафедре международных отношений / А. В. Шарапо // Исследование международных отношений в Республике Беларусь: состояние и перспективы. К 25-летию кафедры международных отношений: материалы респ. науч.-конф. Минск, 6 октября 2017 г. — Минск: Четыре четверти, 2018. — С. 11—18.

4. Снапкоўскі, У. Е. Вызначальны пачатак: аб першых гадах працы кафедры міжнародных адносін БДУ / У. Е. Снапкоўскі // Исследование международных от-

ношений в Республике Беларусь: состояние и перспективы: материалы респ. науч.-практ. семинара, посвящ. 30-летию каф. междунар. отношений Белорус. гос. ун-та, Минск, 6 окт. 2022 г. — Минск: БГУ, 2022. — С. 21—31.

5. Шарапо, А. В. К юбилею кафедры международных отношений БГУ: история и настоящее / А. В. Шарапо, Е. В. Демидович // Исследование международных отношений в Республике Беларусь: состояние и перспективы: материалы респ. науч.- практ. семинара, посвящ. 30-летию каф. междунар. отношений Белорус. гос. ун-та, Минск, 6 окт. 2022 г. — Минск: БГУ, 2022. — С. 9—20.

6. Снапкоўскі, У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: Вучэбны дапаможнік для студэнтаў міжнародных адносін у 2 ч. / У. Е. Снапкоўскі. — Мінск: БДУ, 2003—2004.

7. Снапкоўскі, У. Е. Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь: курс лекцый / У. Е. Снапкоўскі. — Мінск: БДУ, 2007. — 183 с.

8. История международных отношений: учеб. пособие: в 4 ч. — Минск: БГУ, 2004—2018.

9. Челядинский, А. А. Теория международных отношений: курс лекций / А. А. Челядинский. — Минск: БГУ, 2004. — 370 с.

10. Внешняя политика Республики Беларусь в 2000-е годы / Ю. И. Малевич [и др.] / под ред. А. В. Шарапо. — Минск.: БГУ, 2011. — 84 с.

11. Лашкевич, С. А. Африка в современном мире / С. А. Лашкевич, А. А. Челядинский. — Минск: Право и экономика, 2010. — 321 с.

12. Свилас, С. Ф. Историография истории международных отношений XIX—XX вв.: учеб. пособие / С. Ф. Свилас. — Минск: БГУ, 2006. — 156 с.

13. Тихомиров, А. В. Внешняя политика Республики Беларусь (1991—2011 гг.) / А. В. Тихомиров. — Минск: Право и экономика, 2014. — 278 с.

14. Хухлындина, Л. М. Европейский Союз: становление и развитие / Л. М. Хухлындина. — Минск: РИВШ БГУ, 2004. — 260 с.

15. Шарапо, А. В. Политические системы и внешняя политика Германии, Австрии и Швейцарии: учеб. пособие / А. В. Шарапо. — Минск: БГУ, 2007. — 231 с